ры яго дзейнасці і паводзін. Іх змест вызначае формы рэалізацыі эстэтычнай культуры. У школьніка змест дзейнасці мае ніжэйшы ўзровень, чым у спецыяліста.

ВНУ ставіць на мэце выпрацаваць устойлівыя творчыя інтарэсы ў студэнтаў.

Працэс сацыялізацыі, выхавання і навучання ў ВНУ і як яго частка эстэтычнае развіццё студэнта прадугледжваюць не аўтаматычнае прыняцце ўсёй масы эстэтычнай інфармацыі ў супярэчнасці і складанасці, а мэтанакіраванае і выбарнае засваенне пэўных каштоўнасцей.

На кожным узроставым этапе ў структуры разумення і паводзін дзейнічаюць свае эстэтычныя крытэрыі. Яны выпрацоўваюцца ў працэсе практычнага асваення свету і ўзаемазвязаны з усімі кампанентамі эстэтычнай культуры асобы. Найбольш высокая ступень сфарміраванасці сістэмы крытэрыяў адлюстроўвае здольнасці асобы граматна, свабодна і поўна меркаваць аб разнастайных эстэтычных з'явах, ацэньваць і класіфікаваць іх , а таксама будаваць сваю творчую дзейнасць у адпаведнасці з сацыяльна значнымі эстэтычнымі нормамі.

Сацыяльнае станаўленне маладога спецыяліста шматгранна, і адна з граней — сцвярджэнне яго творчага патэнцыялу, здольнасцей, якія па-за эстэтычнай культурай цэласна не могуць праявіцца. Адзінства пазнавальнага і творчага пачаткаў у эстэтычнай культуры — вось тая падстава, на якой будуецца эстэтычнае развіццё студэнцкай моладзі.

Ад узроўню сфарміраванасці эстэтычнай культуры студэнта наогул залежыць рэалізацыя патэнцыялу асобы ў будучай спецыяльнай і прафесіянальнай дзейнасці.

Ступень актыўнасці заняткаў студэнтаў у творчых мастацкіх калектывах — канкрэтны паказчык эфектыўнасці арганізацыі эстэтычнага выхаваня.

Спецыяліст без ведання культуры, без засваення яе каштоўнасцей,спецыяліст без шырокага культурнага кругагляду не дасягае прафесійнага майстэрства, бо ў культуры ўсё ўзаемазвязана. Праца, навука, мараль, мастацтва — гэта розныя грані адзінага цэлага.

Праблемы павышэння духоўных запатрабаванняў моладзі, актывізацыя розных формаў выхаваўчай работы, арганізацыя вольнага часу застаюцца вострымі і злабадзённымі. Сёння, на жаль, усё меншае значэнне набываюць асноўныя формы арганізацыі вольнага часу, асабліва ўдзел моладзі ў творчых мастацкіх калектывах.

Кожнае мерапрыемства ў ВНУ павінна быць напоўнена эстэтычным зместам, а маральна-эстэтычная напоўненасць жыцця ва універсітэце падтрымлівае імкненне студэнтаў да развіцця іх эстэтычнай культуры, арыентуе на развіццё творчага патэнцыялу асобы.

Карацееў А.Л.,
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ ЯК АБАВЯЗКОВАЯ ЎМОВА ЯКАСНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКАНАЎЦАЎ У СФЕРЫ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА
**/традыцыі і перспектывы/**

І.Творчая актыўнасць навучэнцаў і яе актуальнасць. На першапачатковым этапе навучання ігры на духавых інструментах у дзіцячых музычных школах, спецыялізаваных сярэднеадукацыйных школах з музычным ухілам мы можам весці размову аб абавязковым уключэнні ў навучальны працэс **элементаў творчасці** ў адпаведнасці з ўзроставымі асаблівасцямі навучэнцаў. У сярэдніх жа спецыяльных навучальных установах (музычныя вучылішчы, вучылішчы культуры і мастацтваў) пытанне аб развіцці творчай актыўнасці навучэнцаў павінна разглядацца як **абавязковая ўмова** падрыхтоўкі музыкантаў. У вышэйшых навучальных установах пытанне аб далейшым развіцці творчай актыўнасці музыкантаў становіцца яшчэ больш актуальным і гэта заканамерна, і вырашацца яно павінна з улікам прынцыпу пераемнасці ў навучанні. Аналіз матэрыялаў па арганізацыі навучальнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у ВНУ дазваляе гаварыць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб дзвюх тэндэнцыях адносін навучэнцаў і студэнтаў да сваіх абавязкаў:

1) выкананне поўнага аб'ему чацвяртных або семестравых праграм, расшырэнне аб'ему вывучаемага матэрыялу з улікам інтарэсу, што, у сваю чаргу, становіча адбіваецца на ўзроўні прафесійнай падрыхтоўкі і дазваляе на дзяржаўных экзаменах такім навучэнцам выконваць не толькі складаныя творы буйной формы, але і дэманстраваць яркае мастацкае ўяўленне, сфарміраваны мастацкі густ, асэнсаванае валоданне мастацка-выразнымі сродкамі, элементы інтэрпрэтацыі;

2) выкананне аб'ему заданняў навучэнцамі за чвэрць або семестр (звычайна не заўсёды ў тэрмін). Як правіла, такія навучэнцы не праяўляюць асаблівай цікавасці да пошуку неардынарных мастацкіх рашэнняў для сваіх праграм, і ўвесь працэс навучання ў іх зводзіцца да таго, каб атрымаць дыплом. Выкладчыкі не заўсёды могуць пераадолець магутны бар'ер інертнасці навучэнцаў і ідуць на вядомы кампраміс-падрыхтоўка дзяржаўнай праграмы часам з заніжанымі патрабаваннямі, дзе можна толькі весці размову аб асобных выканальніцкіх навыках, узнаўленні нотнага тэксту і да т.п.

На наш погляд, і тая, і другая катэгорыі навучэнцаў абавязкова павінны прайсці падрыхтоўку праз выкананне заданняў не толькі навучальна-педагагічнага характару, але і творчага плана. Калі для першай катэгорыі такая задача не толькі па сілах, але і выклікае павышаную цікавасць, то з другой катэгорыяй навучэнцаў яе рашыць значна складаней. Тут выкладчык павінен арганізаваць навучальны працэс такім чынам, каб не выклікаць боязь перад падобнымі заданнямі па прычыне недастатковасці выканальніцкай падрыхтоўкі. Таму аб'ём творчых заданняў для такіх навучэнцаў павінен быць лаканічным. Эфект названага падыходу трэба шукаць не толькі ў выкананні тых заданняў, якія вызначае педагог для навучэнца. Задача па развіцці творчай актыўнасці будзе выканана толькі тады, калі сам навучэнец, на аснове атрыманых навыкаў, будзе выбіраць сабе заданні па жаданні і выконваць іх поўнасцю.

Па прычыне вядомых абставін (рэгламент навучальных і рабочых планаў, неаднолькавая індывідуальная падрыхтоўка кантынгенту навучэнцаў і да т.п.) для навучальнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых установах характэрны пэўны кансерватызм і абмежаванасць. Менавіта таму пытанне аб актывізацыі творчых падыходаў і формаў у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў, асабліва вышэйшай кваліфікацыі, павінна стаць адным з галоўных, апрача выканання пэўных навучальных праграм.

Калі мы звернемся да аналізу навучальнага працэсу, то традыцыйнасць яго відавочная. На занятках з настаўнікам навучэнец атрымлівае канкрэтны метадычны комплекс або яму прапануецца сістэма заняткаў з улікам асобасных дадзеных, ступені падрыхтаванасці, музычнай адоранасці і да т.п. Выкладчык, як правіла, растлумачвае асобныя звесткі па развіццю таго або іншага навыку, дае рэкамендацыі і каментарыі да развучваемага музычнага матэрыялу. Пасля праведзенай самастойнай работы навучэнец на занятках дэманструе вынікі сваёй працы, а затым абгрунтоўвае неабходныя аргументы і магчымую карэктуру выканальніцкага плана (тэхналагічнага, метадычнага, мастацкага), які быў прапанаваны выкладчыкам.

Творчы падыход у працэсе навучання ігры на духавых інструментах нам уяўляецца ў двух накірунках.

1. Пошукі творчых знаходак пад кіраўніцтвам выкладчыка. Для паспяховага выканання заданняў тут, на наш погляд, неабходна ўлічваць наступнае:

— развіццё творчых здольнасцей;

— актывізацыя творчага падыходу да вывучаемага музычнага матэрыялу;

— фарміраванне творчай патрэбнасці навучэнца. Усе пералічаныя фактары могуць рэалізоўвацца у розных выканальніцкіх формах. Гэта могуць быць наступныя формы:

1) індывідуальная самастойная работа над музычным матэрыялам, самастойныя канцэртныя выступленні і інш.;

2) дробнагрупавая або агульнааркестравая (заняткі ў класе інструментальнага ансамбля, заняткі ў складзе аркестравай групы);

3) ансамблевая (развучванне аркестравых партый пад кіраўніцтвам канцэртмайстра ў агульнааркестравай групе аднатыпных інструментаў, работа над музычным творам пад кіраўніцтвам дырыжора на агульнааркестравай рэпетыцыі калектыву).

2. Пошукі творчых рашэнняў самім навучэнцам пасля атрымання пэўных навыкаў у такой рабоце. У плане ўдасканалення свайго прафесійнага майстэрства навучэнцу лепш арыентавацца на наступнае:

1) авалоданне тэхналагічнымі навыкамі і іх прымяненне (асновы гукаўтварэння і гукавядзення, тыпы выканальніцкага дыхання і іх выкарыстанне ў выканальніцкай практыцы);

2) чаргаванне комплексаў штодзённых практыкаванняў і выканальніцкі трэнінг («базінг» — для выканаўцаў на медных духавых інструментах; вытрыманыя гукі; сістэма «ёлачка» па прынцыпу храматычна-разыходзячыхся гукаў уверх і уніз);

3) інструктыўны матэрыял (работа над практыкаваннямі па развіццю тэхнічнай бегласці, работа над гамамі, арпеджыо і да т.п., вывучэнне эцюдаў па прынцыпу ад простага да складанага);

4) мастацка-педагагічны рэпертуар (работа над рознажанравымі творамі ў класе пад кіраўніцтвам выкладчыка, самастойная пазакласная работа над мастацкім рэпертуарам, паказ мастацкіх праграм на экзаменах, заліках, акадэмічных канцэртах);

5) канцэртны рэпертуар (публічнае выкананне значных мастацкіх твораў, магчымасць іх інтэрпрэтацыі на аснове вывучэння музычнага матэрыялу арыгінала, яго рэдакцый і супастаўленне выступленняў вядучых музыкантаў, работа над аркестравымі партыямі, сола ў кантэксце патрабаванняў дырыжора аркестра і сумесны пошук аптымальных мастацкіх рашэнняў з улікам стылістычных асаблівасцей творчасці кампазітара, жанру музычнага твора таго або іншага аўтара).

II. Гістарычныя аспекты творчага падыходу пры навучанні выканаўцаў на духавых інструментах. З мэтай выяўлення станоўчага вопыту і негатыўных з'яў гэтага працэсу намі паэтапна разглядаліся наступныя накірункі духавога выканання ў Беларусі.

1. Народнае духавое выкананне. У першую чаргу тут заслугоўвае ўвагі наглядны аўдыёвізуальны спосаб навучання імправізацыйна-варыяцыйнай манеры народнага духавога музіцыравання, прычым ён захоўваўся на розных гістарычных этапах яго развіцця. Адзначым, што на сучасным этапе побач з гэтым спосабам актыўна выкарыстоўваецца і спосаб саманавучэння (у далзеным выпадку жадаючыя асвоіць народныя духавыя інструменты звяртаюцца да спецыяльнай літаратуры).

2. Прафесійнае выкананне. Адзначым, што гэты накірунак развіцця духавой музыкі даволі разнастайны.

-- Ваенныя музыканты. Цікавасць уяўляюць спосаб навучання сурмачоў у ваенных дружынах XII—XIII стст., сістэма падрыхтоўкі музыкантаў інструментальных капэл і аркестраў XVI—XVIII стст., павышэнне выканальніцкага майстэрства ў аркестрах XIX—пач.XX ст., сучасныя падыходы ў навучанні ваенных музыкантаў, уключаючы работу з выхаванцамі аркестраў.

-- Музыканты пажарных дружын і таварыстваў. Адзначым мэтанакіраванасць падрыхтоўкі музыкантаў аркестраў у XIX ст., асаблівую практыку работы з выхаванцамі на пачатку XIX стагоддзя.

-- Грамадзянскія выканаўцы. Тут цікавасць выклікае сістэма навучання ў «бурсах музычных» пры іезуіцкіх манастырах у XVI ст., дзе навучанне ажыццяўлялася на розных інструментах. Музыканты валодалі, як правіла, двума - трыма інструментамі дастаткова добра. Стройная сістэма навучання і развіцця творчых здольнасцей існавала ў прыгонных аркестрах XVIII ст., прафесійных аркестрах XIX— пачатку XX ст., якая на новым якасным ўзроўні развіваецца ў навучальных пачатковых, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых музычных установах сучаснага перыяду.

3. Аматарскае музіцыраванне. Тут неабходна адзначыць сістэмны характар навучан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня музыкантаў у аматарскіх аркестравых саставах навучальных устаноў па спецыяльных нотных зборніках, а таксама інтэнсіўныя спосабы падрыхтоўкі музыкантаў сучасных аматарскіх аркестравых саставаў.

III. Шляхі фарміравання творчай актыўнасці выканаўцэў на духавых інструментах. Вывучэнне гістарычнага, метадычнага матэрыялу, аналіз сучаснай выканальніцкай практыкі дазваляюць вызначыць наступныя асноўныя накірункі:

1) Фарміраванне зацікаўленасці ў сумесным музіцыраванні навучэнцаў і актыўнасці іх уключэнне ў пастаянную ансамблевую, аркестравую выканальніцкую практыку. Такі вопыт работы будзе найбольш эфектыўны пры ўмове, калі яго пачынаць укараняць ужо ў пачатковым звяне сістэмы падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых інструментах.

2) Апрабацыя атрыманых выканальніцкіх навыкаў у рабоце над музычнымі творамі ў час публічных сольных канцэртных выступленняў, выканання сола з аркестрам, выканання аркестравага сола.

3) Знаёмства з навінкамі нотнай, спецыяльнай метадычнай літаратуры, вывучэнне музычных аўдыё- і відэазапісаў. На аснове гэтай работы прынцып інтарэсу адыграе важную ролю ў пошуку мастацкіх рашэнняў для таго або іншага музычнага твора.

**Смолік А.І.,**
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА АСНОВЕ КАМП'ЮТЭРЫЗАЦЫІ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ

Адным з актуальных пытанняў гістарычнай адукацыі з'яўляецца спалучэнне дыдактыкі з тэхналогій навучання. Апошняя ўяўляе сабой сістэму прымянення тэхналогіі і вызначэння ўсяго працэсу выкладання і засваення ведаў з улікам тэхнічных і чалавечых рэсурсаў, іх узаемадзеяння для дасягнення аптымізацыі формаў адукацыі. На сучасным этапе ўзаемадзеянне дыдактыкі і тэхналогіі адбываецца не толькі праз прымяненне тэхнічных сродкаў навучання, але і праз укараненне ЭВМ у навучальны працэс. Камп'ютэрызацыя адукацыі ідзе ,як вядома, у двух напрамках: дасягненне студэнтамі камп'ютэрнай пісьменнасці і прымяненне ЭВМ для навучання розным дысцыплінам. У развіцці першага напрамку дасягнуты значныя поспехі. У вучэбныя планы ўсіх ВНУ ўключаны інфарматыка і шэраг дысцыплін, якія звязаны з ЭВМ. Паступова пашыраецца прымяненне камп'ютэраў на семінарскіх занятках не толькі па матэматыцы, дысцыплінах прыродазнаўчага цыкла, а таксама пры выкладанні гуманітарных прадметаў, у тым ліку і гісторыі.

Узаемасувязь гістарычных дысцыплін з пазнавальнымі і тэхнічнымі сродкамі прывяла да ўтварэння такой новай галіны навуковых ведаў, як гістарычная інфарматыка. Яна ўзнікла на стыку камп'ютэрных тэхналогій, крыніцазнаўства і метадаў гістарычных даследаванняў і выкладання гісторыі.

Інфарматызацыя гістарычнай адукацыі з'яўляецца доўгатэрміновым працэсам, які будзе разгортвацца на працягу бліжэйшых гадоў. Ён звязаны са стварэннем праграмна-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу. У Беларусі ёсць пэўны вопыт распрацоўкі камп'ютэрных навучальных праграм па гісторыі. Аднак у ВНУ пакуль што часцей у навучальны працэс укараняюцца тэставыя праграмы. Дзякуючы ім выкладчыкі праводзяць кантроль ведання студэнтамі асноўных гістарычных падзей, тэрмінаў, прозвішчаў і інш. З дапамогай існуючых камп'ютэрных праграм можна высветліць, наколькі здольны студэнты ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж аб'ектамі засваення.

Такога тыпу праграмы створаны па прынцыпу пытанне — адказ — праверка адказу — каментарый — наступнае пытанне. Праца ў асноўным ідзе ў дыялогавым рэжыме: персанальны камп'ютэр рэагуе на адказ студэнта — дае магчымасць убачыць на экране асабісты варыянт яго адказу і пры памылцы направіць яго, выстаўляе адзнаку і каменціруе яе. Вопыт сведчыць, што з дапамогай ЭВМ студэнт мае



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ